29 жніўня 1792 г. канфедэрацыя ВКЛ заявіла аб падтрымцы з боку "40 тысяч народа літоўскага, брацціяў рознай шляхты ва ўрадах у самім княстве"[21]. Прыведзеная лічба вызначалася колькасцю складзеных акцэсаў. Нельга, аднак, услед за таргавічанамі прымаць факт далучэння да канфедэрацыі за паказчык ухвалення і падтрымкі яе дзейнасці. Разнастайнасць формаў і тэрмінаў далучэння засведчыла захаванне шляхецкай супольнасцю ўласных палітычных прыярытэтаў, выяўленых у працэсе адаптацыі да дзейнасці новай улады ў краіне.

1 Korrespondent Warszawski. 1792. № 48. 21 жн.
2 Гл.: Ibid. № 48. Dodatek. 21 жн.
3 Ibid. № 40. Dodatek. 2 жн.
4 Ibid. № 39. 31 ліп.
5 Гл.: Szczygielski W. Referendum trzeciomajowy. Sejmiki lutowe 1792 roku. todz, 1994. S.359-361.
6 Расійскі дзяржаўны ваенна-гістарычны архіў. Ф. 41. Воп. 1/199. Адз. зах. 174. Арк. 141.
7 Костомаров Н.И. Старый спор. Последние годы Речи Посполитой. М., 1994. С. 450.
8 Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). Ф. 1901. Воп. 1.Адз. зах. 1. Арк. 45а, 46.
9 Korrespondent Warszawski. 1792. № 49. 23 жн.
10 Гл.: Ibid. № 39. 31 ліп.; № 29. 7 ліп.
11 Korespondencja krajowa Stanislawa Augusta z lat 1784 do 1792 (oddruk z Rocznika Towarzystwa Historyczno-Leterackiego w Parizu na rok 1870). Poznari, 1872. S. 256.
12 Гл.: НГАБ. Ф. 1901. Воп. 1 Адз. зах. 1. Арк. 69, 119-120.
13 Гл.: Korrespondent Warszawski. 1792. № 55. Dodatek. 6 верас.
14 Гл.: НГАБ. Ф. 1901. Воп. 1. Адз. зах. 1. Арк. 19-31, 45а-61, 64, 69.
15 Гл.: Тамсама. Арк. 27-29.
16 Гл.: НГАБ. Ф. 1897. Воп. 1. Адз. зах. 1. Арк. 67 адв.
17 Гл.: НГАБ. Ф. 1900. Воп. 1. Адз. зах. 1. Арк. 579.
18 НГАБ. Ф. 1897. Воп. 1. Адз. зах. 1. Арк. 68.
19 НГАБ. Ф. 1900. Воп. 1. Адз. зах. 1. Арк. 594.
20 НГАБ. Ф. 1901. Воп. 1. Адз. зах. 1. Арк. 57; 31.
21 Анішчанка Я.К. Інкарпарацыя: Літоўская правінцыя ў падзелах Рэчы Паспалітай. Мн., 2003. С. 279.

Паступіў у рэдакцыю 21.03.05.

***Вадзім Вадзімавіч Аніпяркоў*** - аспірант кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў. Навуковы кіраўнік - кандыдат гістарычных навук, дацэнт Ю.Л. Казакоў.

*І.У. КАБЯРЭЦ*

# ГРАМАДСКІЯ АРГАНІЗАЦЫІ БЕЛАРУСІ 60-90-х гг. XIX ст.: УМОВЫ СТВАРЭННЯ, ПРАВАВЫ СТАТУС, СТРУКТУРА І АСНОЎНЫЯ НАКІРУНКІ ДЗЕЙНАСЦІ

Анализируются условия создания общественных организаций Беларуси в 60-90-х гг. XIX в. Подчеркивается, что в этот период активизируется процесс самоорганизации общественных сил, начинается разработка законодательных основ деятельности добровольных организаций, происходит постепенное упрощение процедуры их создания. Дается характеристика уставов этих организаций, что позволяет определить их основные функции и структуру.

The article gives the analysis of conditions under which Belarusian public organizations were established in the 1860s - 1890s. It underlines that the period witnessed the self-establishment of public forces, the beginning of the legislation development oriented towards the principle activitiy of public organizations as well as the gradual simplification of the procedure of their establishment. It also presents the description of charters, which makes it possible to define the main functions and structure of these organizations.

Працэс самаарганізацыі грамадскіх сіл актывізуецца з канца 60-х гг. XIX ст., нягледзячы на шматлікія перашкоды. Гэты працэс выявіўся ў імкненні да стварэння грамадскіх арганізацый, добраахвотных таварыстваў'. Значна павялічылася колькасць аб'яднанняў, з'явілася шмат новых відаў арганізацый, узнялася іх актыўнасць, пашырaліся формы і метады работы. Так, у «Аглядзе Мінскай губерні за 1867 г.» адзначалася, што "вызваленне сялян, хуткае развіццё школ, чыгунка, якая прайшла праз губерню ў двух напрамках, і новыя ўстановы - сялянскія, судовыя, народнага аздараўлення і дабрачынныя - зварухнулі грамадства" (тут і далей пераклад аўтара. - *І. К.*). Ажыўленню грамадскага жыцця, безумоўна, спрыяў выхад у маі 1867 г. двух урадавых распараджэнняў: аб спыненні палітычных спраў, якія тычыліся ўдзельнікаў паўстання 1863 г., і палажэн-

няў Камітэта Міністраў аб абмежаванні падсуднасці асоб грамадзянскага ведам-ства ваеннаму суду ў Паўночна-Заходнім краі, што сведчыла пра змягчэнне рэжыму выключных законаў[3].

На працягу другой паловы XIX ст. актыўна распрацоўваліся заканадаўчыя асновы дзейнасці грамадскіх арганізацый. Шэраг законаў, прынятых у гэты перыяд, сведчыў пра афіцыйнае прызнанне грамадскай дзейнасці, незалежнай ад дзяржаўных інстытутаў. Разам з тым размах грамадскай актыўнасці выклікаў асцярожнасць дзяржаўных паліцэйскіх структур. У гэтай сувязі афіцыйныя ўрадавыя дакументы мелі супярэчлівы характар. З аднаго боку, відавочна існавала тэндэнцыя дазволіць стварэнне розных грамадскіх арганізацый, а з другога - было імкненне максімальна абмежаваць і кантраляваць іх дзейнасць. Акрамя таго, заканадаўства Расійскай імперыі, якое рэгламентавала прававы статус грамадскіх аб'яднанняў, прайшло значную эвалюцыю. Гэты працэс выявіўся ў паступовым спрашчэнні працэдуры стварэння грамадскіх арганізацый праз паэтапны пераход функцыі іх дазволу ад вярхоўнай улады (імператара) да міністраў, а потым да кіраўнікоў мясцовага звяна.

Адзінай агульнай нормай аб законным заснаванні таварыстваў быў арт. 117 «Статута аб папярэджанні і перапыненні злачынстваў», але ён не даваў адказу на пытанне: дзе, як і на якіх умовах можна атрымаць дазвол на яго стварэнне. Найменне "законам зацверджанае таварыства" давала падставы меркаваць, што арганізацыі павінны афармляцца ў заканадаўчым парадку. Сапраўды, у «Полном собрании законов» (ПСЗ) можна знайсці зацверджаныя імператарам статуты шэрага таварыстваў, але статуты гэтыя, як правіла, паступалі да імпе-ратара з міністэрстваў праз вышэйшы адміністрацыйны орган - Камітэт Мініст-раў. Такім чынам, парадак дазволу аб'яднанняў у форме зацвярджэння імпера-тарам дазволенага Камітэтам Міністраў статута таварыства, які ўсталяваўся з пачатку XX ст., засноўваўся не на літары закону, а на традыцыі.

У перыяд рэформ 60-х гг. XIX ст. права дазволу некаторых катэгорый аб'яд-нанняў пачало пераходзіць да адпаведных міністраў. У 1862 г. імператарам было прынята рашэнне "на будучы час, у змену існуючага дагэтуль парадку, заснаванне таварыстваў для ўзаемнай дапамогі ці з іншаю дабрачыннай ці агульнакарыснай мэтай, па ўзгадненні з належнымі ведамствамі, прадаставіць Міністэрству ўнутраных спраў"[4]. Універсітэцкі статут 1863 г. даў права міністру народнай асветы дазваляць існаванне навучальных таварыстваў пры універсі-тэтах[5]. У 1866 г. зацвярджэнне статутаў сельскагаспадарчых таварыстваў было перададзена міністру дзяржаўных маёмасцяў (па ўзгадненню з МУС)[6]. Гэты пра-цэс завяршыўся ў 1897 г., калі дазвол амаль усіх астатніх аб'яднанняў таксама быў прадастаўлены міністрам[7]. Да імператара (праз Камітэт Міністраў) працягвалі паступаць справы аб таварыствах, якія прасілі для сябе нейкіх асаблівых правоў і прывілеяў. Усе законы, якія непасрэдным чынам тычыліся грамадскіх арганізацый, засталіся разрозненымі актамі і не былі зведзены ў адзіную агуль-ную норму.

Ва ўстанаўленнях міністэрстваў выдання 1892 г. упершыню ў лік функцый некаторых міністэрстваў і іх падраздзяленняў быў уключаны разгляд статутаў падведамасных грамадскіх арганізацый, але кадыфікатары зрабілі гэта непаслядоўна і бессістэмна. Адпаведныя функцыі шэрага міністэрстваў зафіксаваны не ў іх устанаўленнях, а ў галіновых статутах. Роля цэнтра, які павінен быў накі-роўваць палітыку ўсіх устаноў у адносінах да грамадскіх інстытутаў, адводзілася Дэпартаменту паліцыі Міністэрства ўнутраных спраў. Без санкцыі паліцэйскага ведамства не магла адкрыцца ніводная легальная грамадская арганізацыя[8].

Аднак шматлікасць і разнастайнасць спраў, паступаўшых у міністэрствы спраў аб адкрыцці новых таварыстваў, вымусілі ўлады пайсці на далейшае ска-рачэнне працэдуры. З 1896 г. пачаў уводзіцца парадак, згодна з якім дазвол на адкрыццё спажывецкіх, дабрачынных, пажарных, сельскагаспадарчых і некато-рых іншых аб'яднанняў, якія прымалі выдадзеныя для іх міністэрствамі ўзорныя альбо прыкладныя статуты, давала мясцовая адміністрацыя (генерал-губерна-тары, губернатары, граданачальнікі). Калі ж праект статута не адпавядаў узор-наму, ён павінен быў па-ранейшаму зацвярджацца міністэрствам[9].

Заканадаўства Расіі асобна акрэслівала статус супрацьзаконных арганізацый. Згодна з Законам ад 27 сакавіка 1867 г. «Аб супрацьзаконных супольнасцях», супрацьзаконнымі прызнаваліся наступныя таварыствы: 1) усе тайныя таварыствы, з якою б мэтай яны не ствараліся; 2) усе зборышчы, сходы, таварыствы, гурткі, арцелі і іншыя аб'яднанні, якія праследуюць шкодную мэту, пад якім бы найменнем яны не існавалі, што ўтварыліся ці дзейнічалі па згодзе паміж сабою некалькіх асоб; 3) усе тыя таварыствы, якія пасля атрымання належнага дазволу ўхіляліся ад мэты іх заснавання ці стануць прыкрываць добрымі дзеяннямі такі накірунак, які ў нейкіх адносінах шкодны для дзяржаўнага добраўладкавання ці грамадскай маральнасці; 4) усе тыя таварыствы, якія забароненыя аб'яўленым ва ўстаноўленым парадку палажэннем Камітэта Міністраў[10].

Прадугледжваліся розныя віды пакаранняў, нават зняволенне ў крэпасці на чатыры гады за ўдзел у арганізацыі, якая мела на мэце "супрацьдзеянне распараджэнням урада ці ўзбуджэнне непадпарадкавання... уладам, ці разбурэнне асноў грамадскага жыцця: рэлігіі, сямейнага саюзу і ўласнасці, ці ўзбуджэнне варожасці паміж саслоўямі і наогул паміж... часткамі ці класамі насельніцтва, ці паміж гаспадарамі і рабочымі, а таксама заклік да ўчынення стачак"[11]. Турэмнае зняволенне таксама пагражала за прыналежнасць "да такога роду супольнасцей, якія, хоць і не маюць ніводнай з вышэйзгаданых мэт, але па асабліваму, аб'яўленаму ва ўстаноўленым парадку распараджэнню ўрада забароненыя" (Закон «Аб пакаранні за ўтварэнне супрацьзаконных таварыстваў і ўдзел у іх» ад 4 чэрвеня 1874 г.)[12]. Пакаранне належала і за спробу ўтварэння незаконных таварыстваў, і за сакрыццё іх існавання. Мясцовыя ўлады мелі абавязак пастаянна назіраць за незаконнымі аб'яднаннямі. Так, арт. 727 «Свода губернских учреждений» устанаўліваў наступны парадак: "Станавы прыстаў, даведаўшыся пра існаванне такіх таварыстваў, даносіць пра тое адразу ж павятоваму паліцэйскаму ўпраўленню і робіць усё па правілах судаводства крымінальнага. Павятовае паліцэйскае ўпраўленне адразу ж даводзіць пра гэта да ведама губернатара". Губернатары, акрамя "няўхільнага назірання", мелі права "зачыняць, сваёй уладай, сходы розных прыватных таварыстваў, клубаў і арцеляў у выпадку выяўлення ў іх чаго-небудзь супярэчнага дзяржаўнаму парадку і грамадскім бяспецы і маральнасці, даводзячы, аднак, пры гэтым аб зробленым распараджэнні да ведама Міністэрства ўнутраных спраў і належнага цэнтральнага ведамства па прыналежнасці" (арт. 321 )[13].

У канчатковым выніку змест заканадаўства аб грамадскіх арганізацыях зводзіўся да ўсталявання кола дзяржаўных органаў, якія мелі права дазваляць адкрыццё тых ці іншых аб'яднанняў і зацвярджаць іх статуты. Пры гэтым закон не ўтрымліваў ніякіх прававых нормаў, якімі павінны былі б кіравацца як самі арганізацыі, так і кіруючыя імі органы. Усталяванне гэтых нормаў адносілася выключна да сферы адміністрацыйнага вырашэння, а функцыі, склад, структура, правы і абавязкі грамадскіх аб'яднанняў вызначаліся перш за ўсё іх статутамі. Статут кожнай арганізацыі пачынаўся ўказаннем мэты яе стварэння і спосабаў дасягнення гэтай мэты. Акрамя таго, пералічваліся крыніцы матэрыяльных сродкаў аб'яднання, абавязкі і правы членаў, парадак кіравання і справаздачнасці, вызначаліся пастановы на выпадак яго закрыцця і ліквідацыі.

Паколькі закон праследаваў тыя арганізацыі, якія адхіляліся "ад мэты іх стварэння", таму вялікае значэнне ў статуце надавалася вызначэнню мэты, якая павінна была быць дакладнай і не дапускаць пашыранага тлумачэння. Фармулёўкі мэт звычайна былі стандартнымі для пэўных груп таварыстваў (навуковых, асветніцкіх, сельскагаспадарчых і інш.). Вызначаліся і спосабы дасягнення мэты, пад якімі меліся на ўвазе формы дзейнасці арганізацый, пытанне аб якіх было цесна звязана з правамі аб'яднанняў, бо апошнія маглі дзейнічаць толькі тымі спосабамі, на якія ім давалі правы іх статуты. Кола гэтых спосабаў было розным: у адных арганізацый - дастаткова шырокае, у другіх - зусім вузкае. Найбольш шырокі варыянт статута дазваляў аб'яднанням для дасягнення мэт: 1) ствараць у сваім асяродку чытанні, разважаць на вольныя тэмы і дзейнасць сваю абнародаваць; 2) сачыць за новымі адкрыццямі і паляпшэннямі і імкнуцца карысныя і прыбытковыя з іх зрабіць агульнавядомымі; 3) друкаваць

перыядычныя і іншыя сачыненні; 4) прапаноўваць на конкурс заданы, а лепшыя адказы друкаваць за свае сродкі; 5) прысуджаць залатыя і срэбраныя медалі, грашовыя і іншыя прэміі і пахвальныя лісты; 6) арганізоўваць выставы; 7) пра-водзіць публічныя лекцыі; 8) усім жадаючым карыстацца сваімі бібліятэкай і музеем; 9) раздаваць заданні сваім членам і іншым асобам, якія жадаюць пры-маць удзел у трудах таварыства, і садзейнічаць ім указаннямі, дапаможнікамі і хадайніцтвамі; 10) праводзіць вопыты. Дададзім да гэтага пераліку яшчэ і нека-торыя формы філантропіі - выдачу дапамогі, стварэнне бальніц, прытулкаў, ста-ловых і школ і г. д. Акрамя таго, разам з выставамі і публічнымі лекцыямі гра-мадскія арганізацыі канца XIX ст. маглі праводзіць і некаторыя іншыя мера-прыемствы (спектаклі, канцэрты, балы, экскурсіі і г. д.)[14].

Статуты прадугледжвалі наступныя крыніцы грашовых сродкаў: членскія ўзносы, прыбыткі ад капіталаў, маёмасці, ад платных мерапрыемстваў, ахвяра-ванні, зборы, а ў некаторых выпадках і дзяржаўныя субсідыі[15]. Грашовыя сродкі большасці аб'яднанняў былі нязначнымі, і гэта абмяжоўвала іх дзейнасць не менш, чым ціск адміністрацыі. У статуты нязменна быў уключаны пункт, па яко-му свабодныя сумы арганізацый павінны былі памяшчацца ва ўрадавыя ці га-рантаваныя ўрадам працэнтныя паперы[16]. Аб'яднанні звычайна мелі юрыдыч-ныя правы і магчымасць набываць уласнасць, заключаць здзелкі і г. д.

Членскі склад арганізацый падзяляўся на тры - чатыры катэгорыі: права-дзейныя члены, ганаровыя, члены-карэспандэнты, члены-супрацоўнікі (апошнія дзве звычайна аб'ядноўваліся). Часам вылучаліся і члены-стваральнікі і пажыц-цёвыя члены (што зрабілі крупны ўступны ўзнос замест штогадовага ўзносу). Члены ўсіх катэгорый абіраліся на агульных сходах. У некаторых (але не ва ўсіх) грамадскіх аб'яднаннях для ўступлення неабходны былі рэкамендацыі права-дзейных членаў[17]. Умовы ўступлення значна адрозніваліся ў розных трупах аб'яд-нанняў. Напрыклад, шматлікія арганізацыі прымалі ў свой склад толькі пэўных асоб (часцей за ўсё па прафесійнай прыкмеце). Так, у гарадское таварыства ўрачоў маглі ўступаць толькі ўрачы, фармацэўты, ветэрынары, што жылі ў горадзе ці вакол яго. Сур'ёзным цэнзам мог з'яўляцца і памер членскага ўзносу.

У 90-х гг. XIX ст. асаблівым элементам усіх статутаў стала заўвага, што членамі аб'яднання не могуць з'яўляцца: асобы, якія знаходзяцца на ваеннай службе, ніжнія армейскія чыны і юнкеры, непаўналетнія і асуджаныя. Выключэн-не складалі тыя ваеннаслужачыя, якія мелі класны чын[18]. Арганізацыі валодалі правам выключаць са сваіх шэрагаў членаў, якія парушылі інтарэсы аб'яднання ці "оказавшихся недостойными". У 1880 г. Сенат зацвердзіў, што выкпючэнне з арганізацыі можа быць абмежавана ў судовым парадку.

Прынцып адбору ганаровых членаў быў наступным: "У ганаровыя члены абі-раюцца асобы, што атрымалі асобую вядомасць добрымі пазнаннямі і дасягнен-нямі, а таксама аказаўшыя таварыству важныя паслугі і здольныя быць яму ка-рыснымі"[19]. Асабліва трэба звярнуць увагу на апошнюю трупу - "карысных" асоб. Ганаровыя члены не плацілі ўзносаў, аднак мелі права вырашальнага голасу на сходах. Па спісах ганаровых членаў часам можна дастаткова даклад-на вызначыць палітычны твар арганізацыі. Аб'яднанні, якія вялі навуковую пра-цу, укпючалі ў свой склад членаў-карэспандэнтаў. У гэту катэгорыю траплялі ма-ладыя даследчыкі ці асобы, што дасылалі арганізацыі якую-небудзь інфарма-цыю. Найбольш актыўныя члены-карэспандэнты часта пераходзілі ў правадзей-ныя члены. Члены-супрацоўнікі (члены-спаборнікі) звычайна аказвалі матэ-рыяльнае садзейнічанне сваім аб'яднанням[20].

Асноўнымі органамі ўсіх арганізацый з'яўляліся агульныя сходы і праўленні (саветы), якія яны выбіралі. Некаторыя аб'яднанні падзяляліся на галіновыя ад-дзяленні, а таксама стваралі розныя камітэты і камісіі (пастаянныя і тэрміновыя). Агульныя сходы былі звычайнымі, гадавымі і надзвычайнымі. На звычайных разглядаліся бягучыя справы, на гадавых заслухоўваліся і зацвярджаліся спра-ваздачы, выбіраліся кіруючыя органы, надзвычайныя збіраліся рэдка, па якіх-небудзь выключных справах (напрыклад, для перагляду статута). Для шматлікіх (перш за ўсё навуковых) арганізацый правядзенне агульных сходаў, дзе за-слухоўваліся і абмяркоўваліся розныя паведамленні і даклады, з'яўлялася

асноўнай (а то і адзінай) формай дзейнасці. На сходах іншых аб'яднанняў разглядаліся пераважна арганізацыйныя і фінансавыя пытанні. Парадак правядзення сходаў дакладна рэгламентаваўся статутамі[21].

У склад праўленняў (саветаў) арганізацый звычайна ўваходзілі старшыня, яго намеснік, сакратар, казначэй і некалькі членаў. Разам з падрыхтоўкай сходаў і выкананнем іх пастаноў праўленні ўзаемадзейнічалі з рознымі ўстановамі, арганізацыямі і асобамі, а таксама кіравалі работай аб'яднанняў, якія знаходзіліся пры ўстановах[22]. Кіраўнікі арганізацый у некаторых выпадках зацвярджаліся ўладамі, а часам нават проста прызначаліся.

Большай часткай грамадскія арганізацыі Беларусі былі тэрытарыяльнымі - у маштабе губерні, павета, горада і г. д. Яны мелі на мэце рэалізацыю ініцыятыў насельніцтва ў галінах сельскай гаспадаркі, медыцынскага абслугоўвання, культуры, спорту і інш. Першыя сельскагаспадарчыя таварыствы былі створаны ў Мінску (1876), Віцебску (1877) і Магілёве (1879). З цягам часу выявіліся наступныя тэндэнцыі: скарачэнне рэгіёна ўплыву арганізацый і абмежаванне сферы іх дзейнасці[23]. Але галоўным было тое, што паступова яны страчвалі характар навуковых аб'яднанняў і набывалі больш практычнае значэнне[24], што ў сваю чаргу садзейнічала пашырэнню і развіццю новых метадаў гаспадарання.

Дзейнасць таварыстваў урачоў, створаных у кожным губернскім горадзе, таксама паступова прайшла пэўную эвалюцыю. Адбываўся пераход ад непасрэдна навуковых пошукаў да спроб забяспечыць мясцовыя патрэбы насельніцтва, а як вынік - і да больш - шырокай грамадскай дзейнасці[25]. Так, у Таварыстве мінскіх урачоў з апазіцыйным настроем у 1904 г. было прачытана паведамленне «Урачэбная справа ў сувязі з умовамі рускага жыцця», у якім адзначалася, што пры існуючым у той час дзяржаўным ладзе ніякая барацьба з хваробамі немагчыма; толькі з яго ліквідацыяй урачэбна-санітарная справа можа забяспечыць добрыя вынікі[26].

Практычна ў кожным губернскім горадзе існавалі і аддзяленні агульнарасійскіх арганізацый: Рускага тэатральнага таварыства, Расійскага таварыства абароны жанчын, Расійскага таварыства абароны жывёл. У Гродне функцыянавала аддзяленне Імператарскага рускага таварыства выратавання на водах, а ў Мінску - аддзяленне Таварыства барацьбы з заразнымі захворваннямі, у Вільні - аддзяленне Імператарскага рускага геаграфічнага таварыства і Імператарскага рускага музычнага таварыства[27]. Прадстаўнікі гэтых арганізацый, за выключэннем Рускага геаграфічнага, прызначаліся ў губерні і паветы толькі па рэкамендацыі губернатараў ці, у выключных выпадках, ісправнікаў і паліцмайстраў. Магчымасць улад прызначаць лаяльных кіраўнікоў аб'яднанняў забяспечвала ўмовы для развіцця гэтых арганізацый у губернях. Так, аддзяленні Рускага тэатральнага таварыства існавалі ва ўсіх павятовых гарадах Магілёўскай губерні. Разам з тым не меншай папулярнасцю карысталіся аб'яднанні, створаныя па ініцыятыве мясцовага насельніцтва. Так званая разначынная інтэлігенцыя складала большасць у Мінскім музычна-драматычным таварыстве, Гродненскім і Магілёўскім літаратурна-музычных таварыствах, Мсціслаўльскім музычна-драматычным кружку і ў Пінскім таварыстве аматараў тэатра[28]. У Вільні з 80-х гг. XIX ст. існаваў «Музычна-драматычны гурток аматараў», у склад якога ўваходзілі высокія чыноўнікі і некаторыя мелкія служачыя, а ў 1898 г. у горадзе быў арганізаваны Чыгуначны музычна-драматычны гурток, больш дэмакратычны па свайму складу[29]. У 1892 г. у Мінску пачало работу Таварыства аматараў прыгожых мастацтваў[30], якое аб'ядноўвала апазіцыйна настроеную частку інтэлігенцыі, чыноўнікаў і землеўладальнікаў.

Новы тып грамадскіх арганізацый узнікае ў 70-х гг. XIX ст. Гэта крэдытныя, спажывецкія таварыствы і вытворчыя кааператывы, якія спачатку мелі пераважна арыстакратычны і саслоўны характар, былі заснаваны не на самадзейнасці членаў, а на дабрачынных ці камерцыйных пачатках і вельмі часта выклікалі цікавасць толькі як магчымасць весці грамадскую працу[31]. Аднак паступова адносіны да кааператыўных таварыстваў змяняліся. Іх сталі лічыць процівагай "сацыяльнаму руху", сродкам дапамогі ў змаганні з пралетарызацыяй вёскі і горада, магчымасцю вырашыць працоўнае пытанне. Таму ашчадныя і спажы-

вецкія таварыствы ўзнікалі па ініцыятыве прадвадзіцеляў дваранства, старшынь земскіх упраў ці спраўнікаў. У такія таварыствы ўваходзілі чыноўнікі, працоўныя, афіцэры, мяшчане, памешчыкі і г. д. Да пачатку XX ст. спажывецкія кааператывы існавалі практычна ва ўсіх губернскіх і павятовых гарадах Беларусі[32]. Найбольш распаўсюджанай формай крэдытнай кааперацыі сталі таварыствы ўзаемадапамогі. Самымі буйнымі з такіх арганізацый на Беларусі з'яўляліся таварыствы прыказчыкаў, настаўнікаў і фармацэўтаў. Таварыствы ўзаемнай дапамогі настаўнікаў існавалі практычна ва ўсіх гарадах, дзе былі ўстановы адукацыі. У 90-х гг. былі створаны губернскія аб'яднанні такіх устаноў (1897 г. - Мінскай і Віцебскай, 1899 г. - Віленскай і Гродзенскай, 1900 г. - Магілёўскай). Членамі такіх арганізацый з'яўляліся не толькі настаўнікі, але і "асобы вольных прафесій". Таварыствы былі арганізаваны на дэмакратычных пачатках. Важкім быў і той факт, што афіцыйна зацверджаны статут дазваляў ім займацца не толькі фінансавай дзейнасцю, а гэта адкрывала шлях для з'яўлення самастойнай грамадзянскай ініцыятывы і прывучала да дэмакратычных нормаў дзейнасці[33]. Часта такія таварыствы не абмяжоўваліся толькі вырашэннем эканамічных праблем і паступова палітызаваліся.

У канцы XIX ст. пачынаецца таксама і самаарганізацыя наёмных працоўных. Саюзы рабочых узнікалі ў самых простых формах кас і таварыстваў узаемадапамогі рамеснікаў і рабочых. Таварыствы ўзаемадапамогі развіваліся галоўным чынам у трох накірунках: фабрычна-заводскія касы ўзаемадапамогі (у большасці выпадкаў яны не былі самастойнымі і дзейнічалі пад кантролем адміністрацыі); агульнарабочыя таварыствы ўзаемадапамогі, што аб'ядноўвалі не толькі рабочых розных спецыяльнасцей, але і медыкаў, здольных аказаць рабочым бясплатную медыцынскую дапамогу; прафесійныя таварыствы ўзаемадапамогі рамесных рабочых. Апошнія былі шырока распаўсюджаны на Беларусі другой паловы XIX - пачатку XX ст. У канцы 80-х гг. у Мінску было створана некалькі кас узаемадапамогі рабочых шпалерных і кавальска-слясарных майстэрняў, у 90-х гг. касы ўзаемадапамогі існавалі ў Вільні, Смаргоні, Ашмянах, у 1898 г. пачало працаваць Таварыства чорнарабочых сукнавальных фабрык у Міхайлава Беластоцкага павета Гродзенскай губерні, у 1900 г. - Таварыства ўзаемадапамогі працаўнікоў друку г. Вільні для дапамогі сваім членам у пошуку работы, набыцці танных кватэр, аказанні медыцынскай дапамогі. Адзначым, што вялікая частка рабочых таварыстваў узаемадапамогі ўзнікала не самастойна, а па ініцыятыве гаспадароў і пад апекай мясцовых улад, дзяржава была зацікаўлена ў іх адкрыцці, каб вырашэнне рабочага пытання не набыло рэвалюцыйнага характару. У выніку адбылося тое, што хвалявала ўрад: аб'яднанні рабочых апынуліся пад уплывам рэвалюцыйных элементаў, касы ўзаемадапамогі ператварыліся ў касы стачачнай барацьбы, сталі асяродкам для стварэння нелегальных гурткоў, дзе вялася сапраўдная сацыялістычная прапаганда[34].

Такім чынам, у другой палове XIX ст. паскорыўся працэс уздыму легальнай грамадскай дзейнасці, што было звязана з шэрагам аб'ектыўных прычын: правядзеннем у 60-х гг. XIX ст. буржуазных рэформ, змягчэннем рэжыму выключных законаў і інш. Гэты ўздым выявіўся як у павелічэнні колькасці арганізацый, так і ў значнай актывізацыі іх дзейнасці і ўзрастанні ролі ў жыцці краіны. Царская адміністрацыя ў сваю чаргу пільна катралявала і рэгламентавала дзейнасць гэтых аб'яднанняў.

[1] Гл.: Сакалова М. Легальныя грамадскія арганізацыі Беларусі ў 70-90-я гг. XIX ст. // Беларуси гістарычны часопіс. 1993. С. 29.
[2] Обзор Минской губернии за 1874-1913 г. Мн„ 1875-1914. С. 26.
[3] Гл.: Самбук С.М. Политика царизма в Белоруссии во второй половине XIX века. Мн., 1980. С. 12.
[4] ПСЗ. Собр. 2. Т. 37. Аддз. 1. С. 26.
[5] ПСЗ. Собр. 2. Т. 38. Аддз. 1. С. 635.
[6] Гл.: ПСЗ. Собр. 2. Т. 41. Аддз. 1. С. 383.
[7] Гл.: ПСЗ. Собр. 2. Т. 17. Аддз. 1. С. 61.
[8] Степанский А. Д. Самодержавие и общественные организации России на рубеже XIX — XX вв. С. 8.
[9] Гл.: Там жа. С. 9.
[10] Гл.: ПСЗ. Собр. 2. Т. 42. Аддз. 1. С. 330.
[11] Степанский А.Д. Указ. тв. С. 5.

[12] ПСЗ. Собр. 2. Т. 49. Аддз. 1. С. 853.
[13] Степанский А. Д. Указ. тв. С. 6.
[14] Гл.: Устав Минского общества Любителей изящных искусств. Мн., 1899; Устав Музыкального общества в городе Минске. Мн., 1880; Устав Сталинского добровольного Пожарного общества. Пинского уезда, Минской губернии. Пинск, 1902.
[15] Гл.: Устав Сталинского добровольного Пожарного общества, Пинского уезда, Минской губернии. Пинск, 1902. С. 20.
[16] Там жа. С. 22.
[17] Гл.: Устав Общества Витебских сельских хозяев // Труды первого областного съезда сельских хозяев в г. Двинске в 1903 г. Издание Общества Витебских сельских хозяев. Витебск, 1904. С. II.
[18] Гл.: Устав Сталинского добровольного Пожарного общества...
[19] Устав Общества Витебских сельских хозяев // Труды... С. II.
[20] Гл.: Там жа.
[21] Гл.: Устав Сталинского добровольного Пожарного общества... С. 9-11.
[22] Гл.: Там жа. С. 16-20.
[23] Гл.: Протоколы заседаний общего собрания Могилёвского общества сельских хозяев. Могилёв, 1893. С. 8.
[24] Гл.: Список сельскохозяйственных обществ. СПб., 1905. С. 7.
[25] Гл.: Протокол заседания общества минских врачей по случаю 25 летнего юбилея. Мн., 1893. С. 12-13.
[26] Гл.: Бонч Асмалоўскі А. Ліберальна-апазіцыйны рух на Беларусі // Беларусь. Нарысы гісторыі, эканомікі, культурнага і рэвалюцыйнага руху: 36. / Саст. А. Сташэўскі, 3. Жылуновіч, Ў. Ігнатоўскі. Мн., 1924. С. 175.
[27] Гл.: Памятная книжка Виленской губернии на 1851-1915 г. Вильна; Памятная книжка Витебской губернии на 1864-1914 г. Витебск; Памятная книжка Минской губернии на 1845-1916 г. Мн.; Памятная книжка Могилевской губернии на 1861-1916 г. Вильна.
[28] Гл.: Памятная книжка Минской губернии на 1890 г. Мн. С. 33; Памятная книжка Могилевской губернии на 1895 г. Могилев. С. 77.
[29] Гл.: Памятная книжка Виленской губернии на 1887 г. Вильна. С. 71; на 1892 г. С. 73; на 1898 г. С. 72.
[30] Гл.: Устав Минского общества любителей изящных искусств. Мн., 1892.
[31] Гл.: Хейсин М.Л. История кооперативов в России. Все виды кооперации с начала её существования до настоящего времени. Л., 1926. С. 45.
[32] Гл.: Памятная книжка Виленской губернии на 1851-1915 г. ...; Памятная книжка Витебской губернии на 1864-1914 г. ...; Памятная книжка Минской губернии на 1845-1916 г. ...; Памятная книжка Могилевской губернии на 1861-1916 г. ...
[33] Гл.: Баргдановіч А. Да гісторыі партыі «Народная воля» ў Мінску і Беларусі // Маладосць. 1995. № 11. С. 232.
[34] Гл.: Сакалова М. Легальныя грамадскія арганізацыі Беларусі ў 70-90-я гг. XIX ст. // Беларускі гістарычны часопіс. 1993. С. 31.

Паступіў у рэдакцыю 17.05.05.

***Ірына Уладзіміраўна Кабярэц*** **-** аспірантка кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу. Навуковы кіраўнік- кандыдат гістарычных навук, дацэнт А.Г. Каханоўскі.

*А.А. ЕГОРЕЙЧЕНКО*

# ИСТОРИЯ ИЗУЧЕНИЯ КУЛЬТУР ШТРИХОВАННОЙ КЕРАМИКИ В КОНЦЕ XIX - ПЕРВОЙ ТРЕТИ XX в.

Рассматривается начальный этап изучения культур штрихованной керамики в конце XIX - начале XX в., когда на территории Беларуси и Литвы проводились первые раскопки Ф. Покровским, В. Каширским, Л. Крживицким, А. Лявданским. Делается вывод: наибольший вклад в исследования этих культур внес А. Лявданский, выделивший в отдельную группу городища со штрихованной керамикой.

The article considers the initial stage of studying Hatched Pottery cultures when the first excavations were held on the territory of Belarus at the end of XIXth - the beginning of XXth century by F. Pokrovsky, V. Kashirsky, L. Krzhivitsky, A. Ljavdanky. It gives the conclusion that the most significant contribution to the study of these cultures was made by A. Ljavdanky, who defined sites with the hatched pottery as a separate group.

Описание ряда городищ, позднее причисленных к культурам штрихованной керамики, содержится уже в некоторых источниках середины - второй половины XIX в. Информация о них крайне незначительная. Как правило, это просто фиксация отдельных памятников, которая имеет в настоящее время чисто историографический интерес[1]. Отсутствие фактологической базы тем не менее не мешало отдельным авторам иметь свое суждение о назначении этих памятников. Большинство исследователей того времени (К. Гревинк, А. Киркор, К. Тышкевич) приписывало городищам различные функции. Некоторые из них (укрепленные поселения, убежища) подмечены верно, другие - весьма далеки от реальных (вечевые сходбища, судилища, места жертвоприношений)[2].